Асцярожнасць — перш за ўсё

Зіма сёлета, як заўважылі многія, наступіла згодна з календаром. Выпала даволі шмат снегу, мароз з кожным днём мацнее. Аднак ці гатовыя да такога надвор'я, а таксама яго наступстваў людзі? Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі на тэму «Асаблівасці работы ратавальнікаў у зімовы перыяд» пагаварылі спецыялісты, якія яшчэ раз нагадалі аб правілах бяспекі зімой, калі рызыка трапіць у надзвычайную сітуацыю ўзрастае.

Начальнік Мінскай гарадской ратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага грамадскага таварыства ратавання на водах Дзяніс ЧАШУН заклікаў грамадзян не выходзіць на неакрэплы лёд. «У хуткім часе мы чакаем наплыў рыбакоў, — паведаміў ён. — Штогод ім даводзіцца інфармацыя аб тым, што выхад на ваду ў пачатку зімы небяспечны, бо лёд яшчэ не стаў моцны. Акрамя таго, каля вадаёмаў мы часта сустракаем дзяцей без суправаджэння дарослых, што таксама можа прывесці да сумных наступстваў».

— Таварыства ратавання на водах штотыднёва размяшчае на сваіх рэсурсах інфармацыю аб таўшчыні лёду, а таксама аб абставінах, якія могуць накладваць абмежаванні на выхад на ваду, — расказаў начальнік станцыі «Камсамольскае возера». — Калі вы ўбачылі, што чалавек праваліўся пад лёд, неадкладна паведаміце аб гэтым па тэлефону 101 або 112. Прафесійныя ратавальнікі прыедуць на месца і будуць гатовыя да любой сітуацыі. Добра, калі чалавек праяўляе гераізм, але трэба ведаць меру. Часцей за ўсё мы выязджаем на ратаванне аднаго чалавека, а ў выніку даводзіцца ратаваць некалькіх. Не варта пераацэньваць свае сілы.

Забараняецца выходзіць на лёд падчас ледаставу, да дасягнення таўшчыні лёду сямі сантыметраў, а таксама ў перыяд інтэнсіўнага растання і разбурэння лёду. Падчас падлёднай рыбалкі не рэкамендуецца прабіваць шмат лунак на блізкай адлегласці, скакаць і бегаць па лёдзе, збірацца вялікімі групамі. Кожнаму рыбаку пры выхадзе на падлёдную рыбалку варта ўзяць з сабой выратавальную камізэльку і вяроўку даўжынёй 15—20 метраў з пятлёй на адным канцы і грузам (вагой 400—500 грамаў) на другім.

Ратавальнікі рэкамендуюць: калі вы праваліліся пад лёд, трэба дзейнічаць хутка і рашуча. Калі пацярпелы не змог самастойна выбрацца з вады і да яго прыбыла падмога, падчас ратавання варта выкарыстоўваць лесвіцы, дошкі, жэрдкі, вяроўкі і іншыя падручныя сродкі шляхам іх падачы таму, хто праваліўся пад лёд. Пры гэтым набліжацца да пацярпелага варта лежачы або паўзком, пажадана — абапіраючыся на прадметы, якія павялічваюць плошчу апоры. Калі ратавальнікаў двое ці больш, лепш утварыць ланцужок, утрымліваючы адзін аднаго за ногі.

Начальнік галоўнага ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый ТУРЧЫН акцэнтаваў увагу на эксплуатацыі печаў у зімовы перыяд, а таксама падкрэсліў, што цяпер найбольш небяспечны час для пажараў. «За 11 месяцаў бягучага года ў стане алкагольнага ап'янення знаходзілася 325 загінулых падчас пажараў людзей (гэта 55 % ад усіх загінулых з гэтай прычыны ў краіне), — адзначыў прадстаўнік МНС. — Неасцярожнасць пры курэнні прывяла да гібелі 374 чалавек (63,5 % ад агульнай колькасці загінулых на пажарах)».

Павелічэнне ў зімовы перыяд зваротаў насельніцтва ў службу хуткай дапамогі адзначыў **загадчык падстанцыі № 11 Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Яўген ЮДАКОЎ.** «Гэта звязана як з сезоннымі прастуднымі захворваннямі, вірусам грыпу, а апошнім часам і з каранавірусная інфекцыяй, часцей узнікаюць галалёдныя траўмы, — канстатаваў урач хуткай медыцынскай дапамогі. — Апошнім часам абвастрылася праблема дзіцячага траўматызму пры катанні на цюбінгах у неабсталяваных для гэтага месцах. Звяртаюся да бацькоў: не пакідайце сваіх дзяцей без нагляду і не дазваляйце катацца на цюбінгах там, дзе для гэтага не створана адпаведных умоў!»

Прадстаўнік аховы здароўя паведаміў, што ўсё часцей па медыцынскую дапамогу звяртаюцца з нагоды пераахаладжэння. «Як правіла, пацярпелыя ў асноўным знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення, — падкрэсліў урач. — Ёсць памылковае меркаванне, што, ужываючы алкаголь, можна сагрэцца. Гэта абсалютна не так! Алкаголь выклікае ўяўнае адчуванне цяпла, пры гэтым, наадварот, узмацняецца цеплааддача, і пераахаладжэнне, у тым ліку гібель, наступіць ад холаду нашмат хутчэй, чым у чалавека, які алкагольныя напоі не ўжываў».

Вераніка КАНЮТА.

Навінкі кнігарні

Колькі колераў у лета?..

Генадзь Аўласенка — вядомы беларускі паэт і празаік, які шмат піша і для дзіцячага чытача. Творы літаратара пастаянна друкуюцца ў дзіцячых часопісах «Вясёлка», «Буся», «Бярозка», «Качели», «Весёлый зоопарк», у розных калектыўных зборніках. І таму не дзіўна, што кнігі Генадзя Аўласенкі хутка разыходзяцца з паліц кнігарняў і не залежваюцца ў выдавецтве. І часам перавыдаюцца. Як, напрыклад, зборнічак вясёлых і цікавых, пазнавальных вершаў «Зайка польку танцаваў», які толькі што ўбачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда». Першае выданне кнігі было здзейснена ў 2016 годзе.

«Зайка польку танцаваў: / Чаравічкі сапсаваў. / Вось як Зайку не шанцуе! / Зайка болей не танцуе. / Ён цяпер сядзіць, бядуе... / Можа, хто і пашкадуе? / Можа, купіць чаравічкі, / Чаравічкі-невялічкі...» Вершы Генадзя Аўласенкі напоўнены фантазіяй, гумарам... *«Я скажу вам без маны: / У мяне жывуць слаты! / Я кармлю іх салам з хлебам... / Што? Не верыце? / Не трэба!» («Фантазёр»). «Табурэт да табурэта — / Атрымалася... ракета!» («Касманаўт»).*

Выдадзеная накладам 1000 асобнікаў, кніга дзіцячых вершаў і загадак «Зайка польку танцаваў» Генадзя Аўласенкі ўжо прыйшла ў кнігарні. Набыць зборнік можна і ў «Акадэмкнізе» ў Мінску па адрасе: Мінск, праспект Незалежнасці, 72. Некаторыя з асобнікаў кнігі пісьменнік падпісаў сваім юным чытачам. Чым не падарунак?!

Мікола БЕРЛЕЖ.

Беларуская эстрада займела сваю «энцыклапедыю»

Іначай як сапраўдным энцыклапедычным даведнікам работу вядомай беларускай музыказнаўцы Вольгі БРЫЛОН «Беларуская эстрада. Настальгічны дывертысмент» і не назавеш.

Кніга, якая толькі што ўбачыла свет, уражвае сваімі памерамі. Нават задумваешся, ці пад сілу было тое зрабіць аднаму чалавеку — сабраць столькі інфармацыі, знайсці мноства фотаздымкаў, рознага характару дакументаў, архіўных матэрыялаў. Вольга Брылон справілася з гэтым клопатам на высокім узроўні. Няма ніякіх сумненняў, што кніга выкліча цікавасць і ў чытачоў-спецыялістаў, і ва ўсіх, хто нераўнадушны да гісторыі беларускай эстрады.

14 снежня а 17-й гадзіне ў «Акадэмкнізе» ў Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72 пройдзе прэзентацыя выдання Вольгі Брылон «Беларуская эстрада. Настальгічны дывертысмент. Гісторыя эстрады Беларускай дзяржаўнай філармоніі: 1930—1980-я гады». Сярод ганаровых гасцей імпрэзы — сузаснавальнік ВІА «Песняры» Уладзіміра Мулявіна, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў Місевіч, а таксама — старэйшая дачка «песняра» Марына Мулявіна. Пастарайцеся наведацца на прэзентацыю — і вы будзеце мець магчымасць не толькі ўбачыць кнігу, пагартаць яе, але і набыць з аўтографам аўтара.

Сяргей ШЫЧКО.

ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) с дополнением от 10.08.2021 № 151 (29520), от 02.10.2021 № 190 (29559), от 27.10.2021 № 207 (29576), от 13.11.2021 № 220 (29589)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика).

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517), следующие дополнения:

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

- 1 (одна) трехкомнатная квартира № 80 (проектный) общей площадью по проекту 91,4 кв. метров на 3-м этаже 3-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1500 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США;

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 174 (проектный) общей площадью по проекту 36,9 кв. метров на 8-м этаже 4-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1550 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364) с дополнением и изменением от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516), от 11.09.2021 № 175 (29544), от 02.10.2021 № 190 (29559)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства машино-мест в гараж-стоянке, расположенной в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364) с дополнением и изменением от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516), от 11.09.2021 №175 (29544), следующие дополнения:

Сведения о количестве объектов долевого строительства (машино-мест), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

1 (одно) машино-место № 47 общей площадью по проекту 21,50 кв. метров, расположенное на 1 подземном уровне гараж-стоянки. Стоимость машиноместа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 11 000 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 12 000 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392-20-45 (46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.